УДК 902.2:728.83 DOI 10.63874/2218-0281-2025-2-21-28

***Аляксандр Аляксандравіч Башкоў***
*д-р гіст. навук, дац., праф. каф. гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Aliaksandr Bashkou***
*Doctor of Historical Sciences, Associate Professor,*
*Professor of the Department of History of History of Belarus and Special Historical Disciplines*
*of Brest State A. S. Pushkin University*

# АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ ШЛЯХЕЦКІХ (ДВАРАНСКІХ) СЯДЗІБ І РЭЗІДЭНЦЫЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ І РАСІІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XXI ст.

*Даецца характарыстыка асноўных этапаў вывучэння шляхецкіх (дваранскіх) сядзіб і рэзідэнцый эпохі Новага часу на тэрыторыі сучаснай Беларусі і Расіі прадстаўнікамі гуманітарных навук: краязнаўцамі, гісторыкамі, гісторыкамі архітэктуры і мастацтвазнаўцамі. Робіцца спроба акрэсліць асноўныя заканамернасці і тэндэнцыі ў падыходах беларускіх, польскіх і расійскіх навукоўцаў да вывучэння дадзенай катэгорыі помнікаў.*

***Ключавыя словы:*** *сядзіба, рэзідэнцыя, шляхта, дваранства, архітэктура, гісторыка-культурная каштоўнасць.*

## *The Main Trends in the Study of Gentry (Noble) Estates and Residences on the Territory of Belarus and Russia in the 19th – early 21st Centuries*

*The paper describes the main stages of the study of gentry (noble) estates and residences of the Modern era in the territory of modern Belarus and Russia by representatives of the humanities: local historians, historians, architectural historians and art historians. An attempt is made to outline the main patterns and trends in the approaches of Belarusian, Polish and Russian scientists to the study of this category of monuments.*

***Key words:*** *manor, residence, gentry, nobility, architecture, historical and cultural value.*

## Уводзіны

На сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі ў Беларусі і Расіі шляхецкія (дваранскія) сядзібы і рэзідэнцыі эпохі Новага часу разглядаліся як аб'екты выключна гісторыка-культурнага значэння або помнікі архітэктуры. Сёння даступны даследаванні гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў архітэктуры і краязнаўцаў, праведзеныя на працягу апошніх двух стагоддзяў. Аднак ў апошнія дзесяцігоддзі адзначаецца павышэнне цікавасці да сядзіб і рэзідэнцый з боку археолагаў. Каб зразумець увесь спектр актуальных праблем, з якімі сутыкаюцца даследчыкі пры вывучэнні і захаванні дадзенай катэгорыі помнікаў на тэрыторыі Беларусі і Расіі, неабходна ахарактарызаваць асноўныя тэндэнцыі ў гэтых даследаваннях прадстаўнікамі гуманітарных навук, што і з'яўляецца асноўнай мэтай прадстаўленай працы.

## Асноўная частка

З XIX ст. на тэрыторыі сучаснай Расіі вывучэнне дваранскіх сядзіб прайшло доўгі шлях развіцця ад папулярызаванага апісання да станаўлення так званага «усадьбоведения». Першапачаткова публікаваліся замалёўкі пра асаблівасці добраўпарадкавання і арганізацыі жыцця, а таксама культурныя мерапрыемствы ў дваранскіх гаспадарках. Усе яны, як правіла, насілі апісальны характар. У другой палове XIX ст. з'яўляюцца даведнікі па знакавых маёнтках Расійскай імперыі, а з пачатку XX ст. павышаецца цікавасць да побыту і асаблівасцяў памешчыцкай культуры. Падобныя нататкі публікаваліся ў шэрагу спецыялізаваных выданняў «Старые годы» і «Столица и усадьба» [1, с. 30–31].

На тэрыторыі Расіі са снежня 1922 г. пачынаецца новы этап у вывучэнні дваранскай сядзібы, калі яна становіцца аб'ектам навуковага вывучэння, а «усадьбоведение» вылучаецца як асобны накірунак у гістарычнай навуцы. Менавіта ў гэтым годзе мастацтвазнаўцамі, архітэктарамі і гісторыкамі было створана Таварыства вывучэння рускай сядзібы (ТВРС). Спецыялістаў цікавілі такія сферы, як гісторыя, архітэктура,

садова-паркавае будаўніцтва, прыдворны тэатр, мастацтва, побыт і культура дваранскай сядзібы. Прадстаўнікі таварыства імкнуліся аб'яднаць тэарэтычную і практычную дзейнасць у даследаваннях памешчыцкіх сядзіб, сканцэнтраваўшы ўвагу на апісанні, фатаграфаванні сядзіб і публікацыі вынікаў натурных абследаванняў. Аднак у 1930 г. дзейнасць таварыства была спынена, а большасць яго сяброў рэпрэсавана [1, с. 31].

На тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XIX ст. праяўленне цікавасці да помнікаў гісторыі і архітэктуры трэба звязваць з імкненнем расійскіх уладаў сабраць, сістэматызаваць і прааналізаваць усебаковую «стратэгічную» інфармацыю аб падпарадкаваных тэрыторыях. Гэтым займаліся губернскія статыстычныя камітэты. Іх дзейнасць па зборы правінцыйных геаграфічных, статыстычных і гістарычных дадзеных знайшла сваё адлюстраванне ў выданні «Памятных книжек» па асобных губернях, якія выходзілі ў Расійскай імперыі з 30-х гг. XIX ст. На гэтым фоне нараджаецца цікаўнасць да гісторыі шляхты на далучаных тэрыторыях, а следам і да канкрэтных помнікаў архітэктуры, якія былі яскравым адлюстраваннем матэрыяльнай і духоўнай культуры вышэйшага саслоўя. Праўда, спачатку шляхецкія рэзідэнцыі разглядаліся ў кантэксце агульнагістарычнага развіцця рэгіёна або краязнаўчага матэрыялу.

Прыкладам такой падачы матэрыялу з'яўляецца праца А. К. Кіркора «Живописная Россия», у якой прадстаўлены апісанне і кароткая гісторыя магнацкіх рэзідэнцый у Ружанах і Косаве [2].

У гэты ж перыяд да гісторыі манументальных помнікаў на тэрыторыі Беларусі звяртаюцца польскія даследчыкі. Гэта абумоўлена агульнасцю гістарычнай спадчыны беларускага і польскага народаў, калі яны знаходзіліся ў складзе адзінай дзяржавы – Рэчы Паспалітай. Так, на фоне агульнагістарычнай і геаграфічнай інфармацыі ў шматтомным выданні «Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich», які выдаваўся ў Варшаве ў 1880–1914 гг., падаецца кароткая, але змястоўная інфармацыя, якая тычыцца разглядаемай намі катэгорыі помнікаў [3].

Увага да іх расце ў 20–30-я гг. XX ст., калі Заходняя Беларусь апынулася ў складзе Польскай дзяржавы. У гэты перыяд польскія даследчыкі імкнуліся папулярызаваць гістарычныя і архітэктурныя помнікі «сваіх» нанова набытых тэрыторый з акцэнтам на культурнае адзінства заходнебеларускага рэгіёна з польскімі землямі. У свет выходзіць цэлы шэраг даведнікаў (przewodników) з гістарычнай, геаграфічнай, статыстычнай і краязнаўчай інфармацыяй, сярод якой можна выбраць звесткі па шляхецкіх рэзідэнцыях, сядзібах, фальварках [4–7]. Другі том гісторыка-краязнаўчых нарысаў і фотаздымкаў «Polska w krajobrazach i zabytkach» (1930) дае нам уяўленні пра актуальны на той час выгляд шэрага шляхецкіх рэзідэнцый заходнебеларускага рэгіёна. Сёння гэта дазваляе нам усвядоміць узровень разбурэнняў і страт на гэтых помніках за апошнія 90 гадоў [8].

У савецкі перыяд, асабліва з 1960-х гг., у беларускай навуцы нараджаецца цікавасць да сядзібных і палацава-паркавых комплексаў. Гэта цікаўнасць няўхільна расце да 1980-х гг., а помнікі разглядаюцца ў абагульняльных працах па гісторыі рэгіянальнай, г. зн. беларускай, архітэктуры разам з культавымі і абарончымі збудаваннямі [9; 10]. Аднак ужо ў 80–90-я гг. XX ст. шляхецкія сядзібы і рэзідэнцыі становяцца асобным прадметам даследавання. З'яўляецца шэраг даведачных і тэматычных выданняў, накіраваных на аналіз архітэктурных помнікаў у кантэксце гісторыі асобных архітэктурных стыляў і еўрапейскіх аналагаў [11–15]. Заканамерным вынікам уздыму інтарэсу да вывучэння помнікаў гісторыка-архітэктурнай спадчыны стаў выхад шэрага шматтомных энцыклапедычных выданняў: «Архітэктура Беларусі», «Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область», «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» і інш. У іх прадстаўлена кароткая энцыклапедычная інфармацыя па шэрагу аб'ектаў у кантэксце агульнабеларускага матэрыялу [16–18].

Асобна трэба адзначыць невычарпальны інтарэс да шляхецкіх сядзіб і рэзідэнцый на тэрыторыі Заходняй Беларусі з боку польскай навуковай супольнасці. Сапраўднай навуковай падзеяй стала 11-томнае выданне Рамана Афтаназы «Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej», якое выходзіла ў 1991–1997 гг. і ў якім былі разгледжаны каля 1500 шляхецкіх палацаў

і сядзіб на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай (да падзелу 1772 г.). Рэзідэнцыі і сядзібы на тэрыторыі сучаснай Заходняй Беларусі былі прадстаўлены ў двух першых тамах гэтага выдання [19; 20]. У працы максімальна поўна была прадстаўлена даступная на той час бібліяграфічная, архіўная і іканаграфічная інфармацыя па гісторыі шляхецкіх сядзіб. Для палепшанага ўспрыняцця аб'екты былі згрупаваныя па геаграфічнай прыкмеце, г. зн. па прыналежнасці да ваяводстваў. Аўтар надаў значную ўвагу гісторыі ўладальнікаў сядзіб, іх лёсам і радаводам. Прадстаўлены ў рабоце падбор ілюстрацый і разначасовага фотаматэрыялу дазваляе сёння сфарміраваць уяўленні аб стане архітэктурных помнікаў на той ці іншы перыяд гісторыі.

На фоне абагульняльнай працы Р. Афтаназы польскімі навукоўцамі праводзяцца даследаванні на мікрарэгіянальным узроўні. Прыкладам такой працы стала публікацыя студэнцкім навуковым таварыствам гісторыкаў пры Інстытуце гісторыі Вышэйшай сельскагаспадарчай педагагічнай школы ў Седліцах вынікаў свайго навуковага праекта «Dworki i pałace polskiej szlachty w byłym województwie Brzeskim: przeszłość i teraźniejszość» (1997) [21]. У гэтай каталожнай працы помнікі сядзібнай і рэзідэнцыйнай архітэктуры на тэрыторыі сённяшняй Паўднёва-Заходняй Беларусі прэзентаваліся як «ачагі» польскай шляхецкай высакароднасці. Асноўнай мэтай аўтараў было акцэнтаваць увагу на патэнцыяле польскай культуры на «былых крэсах», што знайшло сваё адлюстраванне ў захаваных помніках сядзібнай і рэзідэнцыйнай архітэктуры. Глыбока аналітычнай працы, на жаль, праведзена не было. Аднак плюсам прадстаўленай публікацыі з'яўлялася ацэнка актуальнага стану (на канец 90-х гг. XX ст.) шэрага архітэктурных помнікаў на паўднёвым захадзе Беларусі. Падмацоўвалася гэта размяшчэннем у тэксце, адпаведна, старых і сучасных фотаздымкаў.

Па сваёй канцэпцыі з вышэйзгаданай працай пераклікаецца кніга Ежы Жанкевіча «Dwór polski i jego otoczenie: Kresy Północno-Wschodnie» (2008) [22]. Праца асвятляе гісторыю шляхецкай архітэктуры на тэрыторыі былых «паўночна-ўсходніх крэсаў», г. зн. і тэрыторыі Паўночна-Заходняй Беларусі. Праз прызму гістарычных падзей XVII–XX стст. аўтар робіць акцэнт на «польскасці» ўладальнікаў разглядаемых сядзіб і рэзідэнцый. Ён прыходзіць да высновы, што шляхецкія сядзібы сталі своеасаблівай апорай польскай культуры на гэтых тэрыторыях. Але ў адрозненне ад папярэдняй кнігі адзначым пільную ўвагу аўтара да штодзённасці, духоўнай і матэрыяльнай культуры жыхароў разгледжаных сядзібных і рэзідэнцыйных комплексаў. Таксама заслугоўваюць увагі высновы Е. Жанкевіча адносна прычын заняпаду сядзібнай культуры ў міжваеннай Польшчы.

Прыведзеныя працы з'яўляюцца яскравымі прыкладамі тэндэнцый у польскай навуцы на мяжы стагоддзяў, калі шляхецкія сядзібы і рэзідэнцыі на ўсходняй тэрыторыі былой Польскай дзяржавы трактаваліся як помнікі толькі польскай культуры, якая, на іх думку, безумоўна дамінавала ў фарміраванні ўсёй элітарнай культуры заходнебеларускага рэгіёна.

У перыяд пасляваеннай гістарыяграфіі (да 1980-х гг.) актыўнасці ў вывучэнні разглядаемай катэгорыі помнікаў на тэрыторыі сучаснай Расіі не адзначалася. Дваранскія сядзібы і рэзідэнцыі разглядаліся ў межах шырокіх гістарычных тэм, якія тычыліся сацыяльна-эканамічных і класавых праблем. У гэты час даследаваннем памешчыцкіх гаспадарак у кантэксце з іншымі навуковымі задачамі займаліся такія навукоўцы, як А. М. Анфімаў, Ю. А. Ціханаў, І. Д. Кавальчанка і інш. Як прыклад мэтанакіраванай каталагізацыі і сістэматызацыі матэрыялаў па дваранскіх сядзібах можна ўзгадаць працу «Сектора сводов», створаную ў 1972 г. у Інстытуце археалогіі РАН для рэалізацыі дзяржаўнай праграмы выдання «Свода памятников истории и культуры» па рэгіёнах СССР [1, с. 31–32].

Аднак у 1992 г. адраджаецца Таварыства вывучэння рускай сядзібы (ТВРС), у якім ізноў аб'ядноўваюцца гісторыкі, мастацтвазнаўцы, рэстаўратары, архітэктары і краязнаўцы. Тым самым пачынаецца новы этап у вывучэнні дваранскіх сядзіб і рэзідэнцый. Праводзяцца навуковыя папулярызатарскія і культурныя мерапрыемствы і форумы, публікуюцца зборнікі навуковых прац з акцэнтам на гісторыка-культуралагічныя аспекты развіцця дваранскай сядзібы [23]. З пачатку 90-х гг. XX ст. ідзе зака-

намерны рост колькасці кандыдацкіх дысертацый, прысвечаных вывучэнню праблем сядзібнай прасторы і сядзібнага побыту. Навуковыя распрацоўкі вядуцца прадстаўнікамі розных спецыяльнасцей: мастацтвазнаўцамі, гісторыкамі архітэктуры, культуролагамі, музеязнаўцамі (Н. А. Бялянкінай, А. А. Гудковым, М. М. Звягінцавай, Т. В. Кавалёвай, А. В. Холадавай, Ю. М. Кузняцовай, Г. І. Арловай, А. У. Румянцавай, Н. Ю. Шаўчэнка, А. А. Шырканавай) [1, с. 32]. Знакавай падзеяй у гістарыяграфіі становіцца вялікая праца спецыялістаў Інстытута расійскай гісторыі РАН «Дворянская и купеческая сельская усадьба в России XVI–XX веков: исторические очерки» (2001). Унікальнасць яе заключаецца не толькі ў маштабным падборы абагульняльных матэрыялаў па гісторыі станаўлення і развіцця памешчыцкай і купецкай сядзібы, але і ў статыстычным аналізе дынамікі прыватнага памешчыцкага і вотчыннага землеўладання з XVI па XX ст. з дакладным падлікам сядзіб [24].

У Беларусі напачатку 2000-х гг. адзначаецца ўсплеск цікавасці да сядзібнай і рэзідэнцыйнай архітэктуры ў выніку павышэння агульнага ўзроўню зацікаўленасці дзяржавы і грамадства да вывучэння і захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Архітэктурная спадчына рэспублікі разглядаецца як неад’емная частка агульнаеўрапейскай культурнай традыцыі, якая ўвабрала ў сябе асноўныя рысы еўрапейскага архітэктурнага вопыту і ўзбагаціла яго сваімі рэгіянальнымі асаблівасцямі і каларытам [25–30]. У пачатку XXI ст. беларуская гістарыяграфія назапасіла даволі значны аб’ём літаратуры па актуальных пытаннях вывучэння шляхецкіх сядзіб і рэзідэнцый. Яе можна падзяліць на некалькі катэгорый: манаграфіі, энцыклапедычныя выданні, артыкулы, тэзісы і матэрыялы канферэнцый, навукова-папулярныя і краязнаўчыя публікацыі, прысвечаныя гісторыі архітэктуры палацава-паркавых комплексаў альбо мастацтвазнаўчаму аналізу асобных катэгорый архітэктурных помнікаў. Значныя даследаванні ў дадзеным накірунку правялі вядомыя спецыялісты: Т. В. Габрусь [25], А. І. Лакотка [27], А. Т. Федарук [29], А. М. Кулагін [26; 31], В. Ф. Марозаў [32–35] і шэраг іншых.

**Заключэнне**

Сёння гісторыю вывучэння шляхецкай (дваранскай) сядзібы на тэрыторыі Беларусі і Расіі можна падзяліць на два этапы – данавуковы, заснаваны на прыкладным апісанні сядзіб, і навуковы міждысцыплінарны. Апошні этап у Расіі даследчыкі дзеляць на тры перыяды: 1920–1930 гг. (дзейнасць ТВРС); 1930–1990 гг. (савецкі перыяд цэнтралізаванага вывучэння сядзіб у межах шырокіх навуковых тэм і праектаў); з 1992 г. і па цяперашні час (адраджэнне ТВРС і актывізацыя рэгіянальнага сядзібазнаўства) [1, с. 32–33].

У Беларусі перыяд 1960-х – канца 1980-х гг. характарызуецца станаўленнем сістэматычнай увагі да шляхецкай сядзібы і рэзідэнцыі як помніка гісторыка-культурнай спадчыны і архітэктурнага аб’екта. Толькі з канца 1980-х гг. з’яўляюцца выразныя тэндэнцыі да павышэння цікаўнасці да разглядаемай катэгорыі помнікаў з боку археолагаў, архітэктараў, гісторыкаў архітэктуры і мастацтвазнаўцаў [36; 37].

Такім чынам, інтарэс да шляхецкай (дваранскай) архітэктуры як найбольш выразнага элемента культурнай ідэнтыфікацыі вышэйшых сацыяльных пластоў, які ўзнік яшчэ ў XIX ст., на працягу ўсяго XX ст. толькі павышаўся. Безумоўна, былі перыяды «зацішша» і «ўздыму». У пачатку XXI ст. даследаванні на тэрыторыі Беларусі і Расіі характарызуюцца спалучэннем намаганняў розных навук для вывучэння феномена шляхецкай (дваранскай) сядзібы. У першую чаргу гэта звязана з адраджэннем у грамадстве цікавасці да сядзібнай прасторы і побыту, а таксама з неабходнасцю навуковага абгрунтавання праектаў рэстаўрацыі і рэканструкцыі сядзібных комплексаў. Шляхецкая (дваранская) сядзіба ў Беларусі і Расіі часта разглядаецца як «ачаг» («гнездо») фарміравання асноў культурнай самабытнасці і патрыятызму. Усе гэтыя тэндэнцыі ў змяненні светапогляду сучаснага беларускага і рускага грамадства, удасканаленне заканадаўства ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, адносны эканамічны рост і інвестыцыйныя праграмы садзейнічаюць павышэнню навуковай цікавасці да разглядаемай катэгорыі помнікаў, а таксама актывізацыі рэстаўрацыйных мерапрыемстваў на знакавых помніках сядзібнай і рэзідэнцыйнай архітэктуры.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Бикулов, Н. А. Усадьба как объект научного изучения и историография ее истории / Н. А. Бикулов // Вестник КГУ им. Н. А. Некрасова. 2013. – № 2. – С. 30–33.

2. Киркор, А. К. Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье / А. К. Киркор. – Репринт. Воспроизведение изд. 1882 г. – 2-е изд. – Минск : БелЭн, 1994. – 550 с.

3. Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich : 15 tomów / pod red. Filipa Sulimierskiego, Bronisława Chlebowskiego, Władysława Walewskiego. – Warszawa, 1880–1914. – 15 t.

4. Maliszewski, E. Przewodnik po Gubernji Grodzieńskiej. Zarys statystyczno-opisowy. Wydawnictwo straży kresowej / E. Maliszewski. – Warszawa : Druk. P. Ambroziewicza, 1919. – 40 s.

5. Marczak, M. Przewodnik po Polesiu / M. Marczak. – Nakładem oddziału Polskiego towarzystwa krajoznawczego w Brześciu nad Bugiem, 1935. – 160 s.

6. Przewodnik po okolicach mickiewiczowskich, rejtanowskich ziemi Nowogródzkiej : z ilustracjami. – Baranowicze : Grafika ; Wilno, 1938. – 111 s.

7. Rouba, N. Przewodnik po Litwie i Białejrusi. – Wilno : Druk. Edmunda Nowickiego, 1919. – 216 s.

8. Polska w krajobrazach i zabytkach : 2 tomy / J. Bułhak [i in.]. – Warszawa : Wydaw. D-ra Tadeusza Złotnickiego, 1930. – 320 s.

9. Квитницкая, Е. Д. Архитектура Белоруссии XVII–XVIII вв. / Е. Д. Квитницкая // Всеобщая история архитектуры : в 12 т. / под ред. П. Н. Максимова (отв. ред.) [и др.]. – Л. ; М. : Изд-во лит. по строительству. – Т. 6. : Архитектура России, Украины и Белоруссии XIV – первая пол. XIX в. – 1968. – 568 с.

10. Чантурия, В. А. Архитектура Белоруссии конца XVIII – начала XIX вв. / В. А. Чантурия. – Минск : Изд-во МВСС и ПО БССР, 1963. – 168 с.

11. Чантурия, В. А. Архитектурные памятники Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск : Полымя, 1982. – 233 с.

12. Кулагин, А. Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии. Вторая половина XVIII – начало XIX в. / А. Н. Кулагин. – Минск : Наука и техника, 1981. – 134 с.

13 Кулагин, А. Н. Архитектура и искусство рококо в Белоруссии (в контексте общеевропейской культуры) / А. Н. Кулагин ; под ред. Г. И. Барышева. – Минск : Наука и техника, 1989. – 240 с.

14. Федорук, А. Т. Садово-парковое искусство Белоруссии / А. Т. Федорук. – Минск : Ураджай, 1989. – 247 с.

15. Якимович, Ю. А. Зодчество Белоруссии XVI – середина XVII в. : справ. пособие / Ю. А. Якимович. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 368 с.

16. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 424 с.

17. Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область / АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора ; редкол.: С. В. Марцелев (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 1990. – 424 с.

18. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – 6 т.

19. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Część 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. Województwa mińskie, mścisławskie, połockie, witebskie / R. Aftanazy. – Wroclaw ; Warszawa ; Kraków : Zakł. Narodowy imienia Ossolińskich, 1991. – T. 1. – 337 s.

20. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Część 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie / R. Aftanazy. – Wroclaw ; Warszawa ; Kraków : Zakł. Narodowy imienia Ossolińskich, 1992. – T. 2. – 473 s.

21. Dworki i pałace polskiej szlachty w byłym województwie Brzeskim: przeszłość i teraźniejszość / oprac. red. Andrzej Chojnacki, Dariusz Grzegorczuk / Instytut Historii Wyższej Szkoły

Rolniczo-Pedagogicznej w Siedlcach, Studenckie Koło Naukowe Historyków przy Instytucie Historii WSP-P w Siedlcach. – Siedlce : IH WSRP, 1997. – 150 s.

22. Żenkiewicz, J. Dwór polski i jego otoczenie : Kresy Północno-Wschodnie / J. Żenkiewicz / Toruń : Wydaw. Adam Marszałek, 2008. – 171 s.

23. Пушкарева, И. М. Навстречу юбилею ОИРУ: продолжение традиций. Роль председателя правления Л. В. Ивановой в изучении русской усадьбы / И. М. Пушкарева // Провинциальные дворянские усадьбы: прошлое, настоящее, будущее : сб. науч. ст. / отв. ред. Т. И. Любина. – Тверь : Твер. гос. ун-т, 2010. – С. 3–18.

24. Дворянская и купеческая сельская усадьба в России XVI–XX веков. Исторические очерки / отв. ред. Л. В. Иванова. – М. : Эдиториал УРСС, 2001. – 784 с.

25. Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь [і інш.] ; уклад. Т. В. Габрусь. – Мінск : Беларусь, 2003. – 351 с.

26. Кулагін, А. М. Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. / А. М. Кулагін. – Мінск : Ураджай, 2000. – 304 с.

27. Локотко, А. И. Историко-культурные ландшафты Беларуси / А. И. Локотко. – Минск : Белорус. наука, 2006. – 470 с.

28. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Нясцярчук. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 336 с.

29. Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук ; ред. Т. Г. Мартыненко. – 2-е изд. – Минск : БелЭн, 2006. – 576 с.

30. Мілючэнкаў, С. А. Магнацкія і шляхецкія маёнткі / С. А. Мілючэнкаў // Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. / А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд.: А. І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 1 : Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатку XX ст. – 2013. – С. 43–65.

31. Кулагин, А. Н. Архитектура и искусство рококо в Белоруссии (в контексте общеевропейской культуры) / А. Н. Кулагин ; под ред. Г. И. Барышева. – Минск : Наука и техника, 1989. – 240 с.

32. Морозов, В. Ф. История архитектуры Беларуси. Эпоха классицизма / В. Ф. Морозов. – Минск : БНТУ, 2006. – 152 с.

33. Морозов, В. Ф. Архитектурные школы в монументальном зодчестве Беларуси конца XVIII – начала XIX в. / В. Ф. Морозов. – Минск : БНТУ, 2011. – 224 с.

34. Морозов, В. Ф. Архитектура пограничья культур Беларуси, Литвы и Польши. Эпоха классицизма / В. Ф. Морозов. – Минск : БНТУ, 2012. – 176 с.

35. Морозов, В. Ф. Стили и направления в архитектуре Беларуси второй половины XVIII – первой половины XIX века / В. Ф. Морозов. – Минск : БНТУ, 2016. – 239 с.

36. Башков, А. А. Становление археологии шляхетских усадеб и резиденций на территории Беларуси в XX в. / А. А. Башков // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1, Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2019. – Т. 11, № 1. – С. 18–29.

37. Башков, А. А. Развитие усадебной и резиденциональной археологии в Беларуси в начале XXI в. / А. А. Башков // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1, Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. 2019. – Т. 11, № 2. – С. 58–72.

## REFERENCES

1. Bikulov, N. A. Usad’ba kak ob’ekt nauchnogo izucheniya i istoriografiya ee istorii / N. A. Bikulov // Vestnik KGU im. N. A. Nekrasova. 2013. – № 2. – S. 30–33.

2. Kirkor, A. K. Zhivopisnaya Rossiya. Otechestvo nashe v ego zemel’nom, istoricheskom, plemennom, ekonomicheskom i bytovom znachenii: Litovskoe i Belorusskoe Poles’e / A. K. Kirkor. – Reprint. Vosproizvedenie izd. 1882 g. – 2-e izd. – Minsk : BelEn, 1994. – 550 s.

3. Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich : 15 tomów / pod red. Filipa Sulimierskiego, Bronisława Chlebowskiego, Władysława Walewskiego. – Warszawa, 1880–1914. – 15 t.

4. Maliszewski, E. Przewodnik po Gubernji Grodzieńskiej. Zarys statystyczno-opisowy. Wydawnictwo straży kresowej / E. Maliszewski. – Warszawa : Druk. P. Ambroziewicza, 1919. – 40 s.

5. Marczak, M. Przewodnik po Polesiu / M. Marczak. – Nakładem oddziału Polskiego towarzystwa krajoznawczego w Brześciu nad Bugiem, 1935. – 160 s.

6. Przewodnik po okolicach mickiewiczowskich, rejtanowskich ziemi Nowogródzkiej : z ilustracjami. – Baranowicze : Grafika ; Wilno, 1938. – 111 s.

7. Rouba, N. Przewodnik po Litwie i Białejrusi. – Wilno : Druk. Edmunda Nowickiego, 1919. – 216 s.

8. Polska w krajobrazach i zabytkach : 2 tomy / J. Bułhak [i in.]. – Warszawa : Wydaw. D-ra Tadeusza Złotnickiego, 1930. – 320 s.

9. Kvitnitskaya, Ye. D. Arkhitektura Belorussii XVII–XVIII vv. / Ye. D. Kvitnitskaya // Vseobshchaya istoriya arkhitektury : v 12 t. / pod red. P. N. Maksimova (otv. red.) [i dr.]. – L. ; M. : Izd-vo lit. po stroitel'stvu. – T. 6. : Arkhitektura Rossii, Ukrainy i Belorussii XIV – pervaya pol. XIX v. – 1968. – 568 s.

10. Chanturiya, V. A. Arkhitektura Belorussii kontsa XVIII – nachala XIX vv. / V. A. Chanturiya. – Minsk : Izd-vo MVSS i PO BSSR, 1963. – 168 s.

11. Chanturiya, V. A. Arkhitekturnye pamyatniki Belorussii / V. A. Chanturiya. – Minsk : Polymya, 1982. – 233 s.

12. Kulagin, A. N. Arkhitektura dvortsovo-usadebnykh ansamblei Belorussii. Vtoraya polovina XVIII – nachalo XIX v. / A. N. Kulagin. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1981. – 134 s.

13 Kulagin, A. N. Arkhitektura i iskusstvo rokoko v Belorussii (v kontekste obshcheevropeiskoi kul'tury) / A. N. Kulagin ; pod red. G. I. Barysheva. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1989. – 240 s.

14. Fedoruk, A. T. Sadovo-parkovoe iskusstvo Belorussii / A. T. Fedoruk. – Minsk : Uradzhai, 1989. – 247 s.

15. Yakimovich, Yu. A. Zodchestvo Belorussii XVI – seredina XVII v. : sprav. posobie / Yu. A. Yakimovich. – Minsk : Navuka i tehknika, 1991. – 368 s.

16. Arkhitektura Belarusi : entsykl. daved. / redkal.: A. A. Voinau [i insh.]. – Minsk : BelEn, 1993. – 424 s.

17. Svod pamyatnikov istorii i kul'tury Belorussii. Brestskaya oblast' / AN BSSR, In-t iskusstvovedeniya, etnografii i fol'klora ; redkol.: S. V. Martselev (gl. red.) [i dr.]. – Minsk : BelEn, 1990. – 424 s.

18. Entsyklapedyya gistoryi Belarusi : u 6 t. / redkal.: M. V. Bich [i insh.]. – Minsk : BelEn, 1993–2003. – 6 t.

19. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Część 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. Województwa mińskie, mścisławskie, połockie, witebskie / R. Aftanazy. – Wroclaw ; Warszawa ; Kraków : Zakł. Narodowy imienia Ossolińskich, 1991. – T. 1. – 337 s.

20. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Część 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie / R. Aftanazy. – Wroclaw ; Warszawa ; Kraków : Zakł. Narodowy imienia Ossolińskich, 1992. – T. 2. – 473 s.

21. Dworki i pałace polskiej szlachty w byłym województwie Brzeskim: przeszłość i teraźniejszość / oprac. red. Andrzej Chojnacki, Dariusz Grzegorczuk / Instytut Historii Wyższej Szkoły Rolniczo-Pedagogicznej w Siedlcach, Studenckie Koło Naukowe Historyków przy Instytucie Historii WSP-P w Siedlcach. – Siedlce : IH WSRP, 1997. – 150 s.

22. Żenkiewicz, J. Dwór polski i jego otoczenie : Kresy Północno-Wschodnie / J. Żenkiewicz / Toruń : Wydaw. Adam Marszałek, 2008. – 171 s.

23. Pushkareva, I. M. Navstrechu yubileyu OIRU: prodolzhenie traditsii. Rol' predsedatelya pravleniya L. V. Ivanovoi v izuchenii russkoi usad'by / I. M. Pushkareva // Provintsial'nye dvoryanskie usad'by: proshloe, nastoyashchee, budushchee : sb. nauch. st. / otv. red. T. I. Lyubina. – Tver' : Tver. gos. un-t, 2010. – S. 3–18.

24. Dvoryanskaya i kupecheskaya sel'skaya usad'ba v Rossii XVI–XX vekov. Istoricheskie ocherki / otv. red. L. V. Ivanova. – M. : Editorial URSS, 2001. – 784 s.

25. Strachanaya spadchyna / T. V. Gabrus' [i insh.] ; uklad. T. V. Gabrus'. – Minsk : Belarus', 2003. – 351 s.

26. Kulagin, A. M. Eklektyka. Arkhitektura Belarusi drugoi palovy XIX – pachatku XX st. / A. M. Kulagin. – Minsk : Uradzhai, 2000. – 304 s.

27. Lokotko, A. I. Istoriko-kul’turnye landshafty Belarusi / A. I. Lokotko. – Minsk : Belorus. nauka, 2006. – 470 s.
28. Nestsyarchuk, L. M. Zamki, palatsy, parki Berastseishchyny X–XX stagoddzyau (gistoryya, stan, perspektyvy) / L. M. Nyastsyarchuk. – Minsk : BELTA, 2002. – 336 s.
29. Fedoruk, A. T. Starinnye usad’by Beresteishchiny / A. T. Fedoruk ; red. T. G. Martynenko. – 2-e izd. – Minsk : BelEn, 2006. – 576 s.
30. Milyuchenkau, S. A. Magnatskiya i shlyakhetskiya maentki / S. A. Milyuchenkau // Narysy gistoryi kul’tury Belarusi : u 4 t. / A. I. Lakotka [i insh.] ; navuk. red.: A. I. Lakotka. – Minsk : Belarus. navuka. – T. 1 : Kul’tura satsyyal’nai elity XIV – pachatku XX st. – 2013. – S. 43–65.
31. Kulagin, A. N. Arkhitektura i iskusstvo rokoko v Belorussii (v kontekste obshcheevropeiskoi kul’tury) / A. N. Kulagin ; pod red. G. I. Barysheva. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1989. – 240 s.
32. Morozov, V. F. Istoriya arkhitektury Belarusi. Epokha klassitsizma / V. F. Morozov. – Minsk : BNTU, 2006. – 152 s.
33. Morozov, V. F. Arkhitekturnye shkoly v monumental’nom zodchestve Belarusi kontsa XVIII – nachala XIX v. / V. F. Morozov. – Minsk : BNTU, 2011. – 224 s.
34. Morozov, V. F. Arkhitektura pogranich’ya kul’tur Belarusi, Litvy i Pol’shi. Epokha klassitsizma / V. F. Morozov. – Minsk : BNTU, 2012. – 176 s.
35. Morozov, V. F. Stili i napravleniya v arkhitekture Belarusi vtoroi poloviny XVIII – pervoi poloviny XIX veka / V. F. Morozov. – Minsk : BNTU, 2016. – 239 s.
36. Bashkov, A. A. Stanovlenie arkheologii shlyakhetskikh usadeb i rezidentsii na territorii Belarusi v XX v. / A. A. Bashkov // Vesnik Grodzenskaga dzyarzhaunaga universiteta imya Yanki Kupaly. Seryya 1, Gistoryya i arkhealogiya. Filasofiya. Palitalogiya. – 2019. – T. 11, № 1. – S. 18–29.
37. Bashkov, A. A. Razvitie usadebnoi i rezidentsional’noi arkheologii v Belarusi v nachale XXI v. / A. A. Bashkov // Vesnik Grodzenskaga dzyarzhaunaga universiteta imya Yanki Kupaly. Seryya 1, Gistoryya i arkhealogiya. Filasofiya. Palitalogiya. 2019. – T. 11, № 2. – S. 58–72.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 07.04.2025*